ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

# Свята, якое натхняе...




*Міністр інфармацыі Ігар Луцкі (злева) уручае Нацыянальную літаратурную прэмію Валерыю Грышкаўцу*

**Дваццаць сёмы Дзень беларускага пісьменства адбыўся 5 – 6 верасня ў старажытным, багатым на гістарычныя падзеі і таленты, маляўнічым горадзе Бялынічы Магілёўскай вобласці.**

Штогод у цэнтры ўвагі ў гэтыя ўрачыстыя дні знаходзяцца пісьменнікі, іх творчыя здабыткі, багатая літаратурная спадчына. Гэта час не-

цыклапедыя імя Петруся Броўкі».

Кожны сезон Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі вылучае кнігі да ўдзелу ў прэстыжным літаратурным конкурсе, рыхтуе праграму выступлення для пляцоўкі «Слова пісьменніка», прадстаўляе на рэспубліканскую выставу лепшых кніг, удзельнічае ў рабоце журы абласнога конкурсу «Жы-

вітальным словам звярнуўся да прысутых празаік, гісторык, журналіст Анатоль Бензярук, пазнаёміўшы слухачоў з цікавымі гістарычнымі звесткамі. Вершамі, прысвечанымі малой радзіме, творчымі планамі падзяліўся празаік і мастак з Баранавіч Мікола Бусько, паэтка Аксана Валуй зачаравала вершамі пра каханне і філасофскай лірыкай; глыбокія жыццёвыя развагі, запаміналь-

забыўных творчых сустрэч, падвядзенне вынікаў плённай літаратурна-выдавецкай працы, а яшчэ – яркае самабытнае свята з восеньскім кірмашом, выставамі мастакоў і рамеснікаў, спевамі, дэкламацыяй вершаў, прыгожымі прамовамі, святочным гандлем кнігамі.

Безумоўна, цэнтральная падзея літаратурнага фестывалю – узнагароджанне пераможцаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Сёлета на галоўнай сцэне падчас адкрыцця свята выбітныя пісьменнікі атрымалі ўзнагароды ў шасці намінацыях. Прыемна, што сярод лепшых зборнікаў паэзіі адзначана кніга вядомага пінскага паэта, былога супрацоўніка абласной газеты «Заря» Валерыя Грышкаўца «Застаюся назаўсёды...», якая выйшла сёлета ў выдавецтве «Беларуская эн-

*Брэсцкая дэлегацыя ў Бялынічах*



вая класіка».

Напярэдадні свята пісьменнікаў парадавала перамога юнага чытальніка, выхаванца Палаца дзіцячай творчасці г. Баранавічы Максіма Васільева. Таленавіта і прачула юнак прачытаў урывак з аповесці Васіля Быкава «Альпійская балада» і стаў лепшым ва ўзроставай катэгорыі сярод вучняў 9 – 10 класаў.

Акрамя таго, у Бялынічах была прадстаўлена тэматычныя экспазіцыя, прысвечаная 1000-гадоваму гораду Брэсту, з ёй можна было пазнаёміцца на пляцоўцы «Кнігі і прэса Рэспублікі Беларусь». А ў павільёне «Слова пісьменніка» кожны меў магчымасць пагартаць кніжныя навінкі, у тым ліку пісьменнікаў Брэстчыны – Зінаіды Дудзюк, Аляксандра Валковіча, Ірыны Морых, Георгія Тамашэвіча... З пры-

ныя лірычныя вобразы сталі адметнасцю выступленняў пінскіх паэтаў Жанны Завацкай і Валерыя Грышкаўца.

Брэсцкая дэлегацыя ўзяла ўдзел у імпрэзе Саюза пісьменнікаў Беларусі «Роднае слова – светлае слова», якая адбылася ў аднаўленай Бялыніцкай дзіцячай школе мастацтваў, пабывала на ўрачыстых адкрыццях скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай Бялыніцкай іконе Божай Маці, і мастацкага музея імя В.К. Бялыніцкага-Бірулі. Літаратары наведалі лесатэхнічны каледж, супрацоўніца якога правяла экскурсію па ваеннай экспазіцыі пад адкрытым небам, пазнаёміла з унікальнымі экспанатамі музея Канстанціна Сіманава.

Свята скончылася, але ярка заблішчаў яшчэ адзін беларускі дыямент – аднаўлены, утульны беларускі гарадок Бялынічы, які і далей будзе прыцягваць увагу турыстаў, натхняць таленавітых і руплівых жыхароў на плённую працу, а пісьменнікаў – на творчасць і праслаўленне нашага вялікага скарба – роднай мовы, зямлі, багатай на таленты і культурныя набыткі, крыніц духоўнасці і асветы. Наступны прыпынак свята – горад Капыль Мінскай вобласці.

**Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ,**
**старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі**